


# УВАГА, АЎТАРЫ!

**Згодна з умовамі нашага творчага спаборніцтва, прыём «проб пяра» ад ахвотных у ім паўдзельнічаць быў скончаны ў пачатку месяца. За час правядзення чарговага конкурсу сярод юных і маладых нештатных аўтараў мы атрымалі некалькі дзясяткаў работ, прычым, як заўсёды, добрая іх частка паступіла літаральна ў самы апошні момант. Каб іх усе прачытаць і падрыхтаваць да друку лепшыя, патрэбны час. Таму публікацыя работ працягваецца! Нагадваем, вынікі творчага спаборніцтва плануецца падвесці да пачатку ўступнай кампаніі (не называючы пакуль даты), каб старэйшыя яго ўдзельнікі — выпускнікі гэтага года, што будуць сёлета «штурмаваць» журфак, — у выпадку перамогі змаглі апроч публікацый у партфоліа і ганаровых грамат атрымаць яшчэ і рэкамендацыі для паступлення. Што тычыцца кароткага аналізу «проб пяра», якія паступілі ў рэдакцыю, дык сярод іх ёсць як напісаныя сапраўды па-журналісцку, так і, на жаль, такія, якія не адпавядаюць умовам конкурсу, найперш у плане творчага складніка. Хто ж будзе прызнаны лепшым? Інтрыга захоўваецца! Мы ж прапануем ахвотным у чаканні падвядзення вынікаў дасылаць нам свае творчыя работы ўжо па-за конкурсам.**

# «СОНЕЧНАЯ МУЗЫКА»,

## або Ад «Ветру ў галаве» да «Новай хвалі»

**Саша Захарык — адна з фіналістак беларускага адбору на «Еўрабачанне-2016». Да сваёй песні яна сама напісала музыку. Трэк называецца Glory Night («Ноч зззяння»). Спявачка нарадзілася ў Мінску. З шасці гадоў захапляецца музыкай. Скончыла музычную школу па класе фартэпіяна. У 12 гадоў пачала прафесійна займацца вакалам. Сваю першую песню напісала ў 14 гадоў. У 2009 годзе брала ўдзел у фінале песеннага конкурсу «ЕўраФэст» у складзе групы «Вецер у галаве». А сёлета плануе выступіць на конкурсе «Новая хваля» ў Сочы ад нашай краіны.**

***— Аляксандра, як з'явілася рашэнне падаць заяўку на адбор «Еўрабачання»?***

— Насамрэч я не планавала ісці на конкурс, але раніцай у апошні дзень падачы заяў мой малады чалавек сказаў, што ў мяне ёсць нядрэнная песня, абяцаў дапамагчы з фанаграмай (ён аранжыроўшчык, мультыінструменталіст). За дзве гадзіны ўсё было гатова, і за дзесяць хвілін да закрыцця пошты мы літаральна пабеглі адпраўляць работу. Праз пару дзён мне патэлефанавалі і сказалі, што я прайшла на адбор. Я была перадапошняя (усяго паступіла каля 100 заяў) і ўвечары таго ж дня даведалася, што прайшла ў дзясятку.

***— У чым адметнасць тваёй выканальніцкай манеры?***

— Мае слухачы і сябры гавораць, што мой стыль можна апісаць словамі «сонечная», «добрая», «пазітыўная» музыка. Пакуль што мне падабаецца развівацца ў гэтым кірунку, але не выключана, што праз пару гадоў будзе падабацца зусім іншы настрой падачы песень. Зусім нядаўна, напрыклад, я напісала кампазіцыю для беларускай кароткаметражкі «Называйце гэта, як хочаце», і яна вельмі адрозніваецца ад майго асноўнага рэпертуару, таму што сумная.

**«Папулярнасць мяне яшчэ не вельмі хвалюе, больш хачу быць пазнавальнай праз свае песні. Але гэта пакуль не асноўная мэта, лічу, што знаходжуся ў творчым пошуку».**

***— Раскажы пра свой шлях творчага станаўлення як спявачкі.***

— Безумоўна, была музычная школа. Сем гадоў па класе фартэпіяна. А праз тры гады, калі быў аб'яўлены адбор на дзіцячае «Еўрабачанне», напісала сваю першую песню. Лічу, што гэта быў вельмі важны этап у маім жыцці, таму што музычнае выхаванне для кожнага артыста — абавязковая рэч. І калі б мая маці ў свой час спынілася і апусціла рукі, то я магла б і не мець такога вопыту.

Таксама былі розныя эстрадныя студыі. У 11 гадоў пайшла ў музычны ансамбль «Рэвю» Наталлі Раманавай. З яго і пачаўся мой творчы шлях як вакалісткі. Затым Ліцэй БДУ. У прынцыпе я паступіла туды з-за таго, што там вялікая сцэна, добры гук і магчымасці для самавыяўлення. Але тады я не ведала, што звяжу сваё жыццё з музыкай, меркавала пайсці або на журфак, або на філфак. А за месяц да паступлення мама мне сказала, каб я лепш пайшла ў артысткі. Ну, я і паступіла ва ўніверсітэт культуры. Потым былі новыя знаёмствы, канцэрты... Я бясконца шчаслівая і магу дзякаваць Богу за магчымасць займацца тым, што люблю.

Зараз спяваю ў кавер-бэндзе «Яблычны чай» (AppleTea), мы запісваем уласныя песні і праводзім карпаратыўныя праграмы. Выконваю пераважна джазавыя песні, таму мяне называюць джазавай спявачкай, але я з гэтым не згодна. Я поп-спявачка. Хутка мы паедзем на джазавы фестываль. Вось там я змагу апраўдаць сваё званне *(усміхаецца)*. Але мне яшчэ трэба грунтоўна падрыхтавацца са сваім бэндам.

***— Ты лічыш сябе папулярнай?***

— Не лічу. Для мяне вельмі важна, як і для любога артыста, які піша сам, каб песні былі пачуты, а кола слухачоў пашыралася. У любым выпадку папулярнасць мяне яшчэ не вельмі хвалюе, больш хачу быць пазнавальнай праз свае песні. Але гэта пакуль не асноўная мэта, лічу, што знаходжуся ў творчым пошуку.

***— Што ўплывае на фарміраванне твайго светапогляду?***



— Безумоўна, кнігі, фільмы, але вандроўкі — найбольш моцная крыніца. Гэта бясконцае натхненне, таму што адкрываеш нешта новае. Ну, і, канешне, музыка. Вельмі люблю слухаць і глядзець відэа з канцэртаў маіх любімых артыстаў: Beyonce, Stevie Wonder, Franklin. Дарэчы, у ліпені я еду ў Амстэрдам на канцэрт Beyonce. Я не магу паверыць: калі набывала квіткі, то плакала ад шчасця.

***— Хто твой кумір?***

— Beyonce, напрыклад, мяне вельмі натхняе як спявачка і жанчына, як танцор, рэжысёр, прадзюсар. Таксама Alicia Keys, Justin Timberlake, Jamiroquai...

***— Якія дасягненні лічыш галоўнымі на творчым шляху?***

— Ну, па-першае, тое, што я пачала сама пісаць песні. Па-другое, Ліцэй БДУ і ўніверсітэт культуры — гэта каштоўны вопыт выступленняў і новыя сябры, якіх я таксама лічу сваім дасягненнем. Канешне, «Яблычны чай». Спяваць з імі было маёй марай. Таксама мой малады чалавек — яшчэ адно дасягненне *(усміхаецца)*. Яго калектыў, работа з ім — найкаштоўнейшы вопыт для мяне. Я вельмі рада, што працую ў гэтым аркестры. Конкурсы і фестывалі не лічу дасягненнямі. Гэта толькі крокі на шляху самаразвіцця.

***— А як ты ставішся да творчых эксперыментаў?***

— З задавальненнем. Было ўжо некалькі праектаў з рэперам Вінсентам. Таксама рэгулярна ёсць прапановы ад беларускіх дыджэяў, якія жадаюць запісаць разам песню. Я мяркую, што ў хуткім часе будзе штосьці цікавае.

***— Ці хапае часу на асабістае жыццё?***

— Так атрымалася, што мой малады чалавек — музыкант. Лічу, што нам пашанцавала, бо і мэты ў нас аднолькавыя, і працуем разам.

***— Што для цябе галоўнае на гэтым этапе жыцця?***

— Імкненне да самарэалізацыі. Трэба многа працаваць, каб ганарыцца сабой. Творчы чалавек заўсёды поўны ідэй і планаў. Але ёсць праблемы з лянотай, я пастаянна з ёй змагаюся...

**Валерыя КАМКОВА,**
**вучаніца 10 класа Ліцэя БДУ.**

**ПРА АЎТАРА**

Валерыя, па яе словах, шмат чытае, любіць спорт і актыўны лад жыцця.

— З дзяцінства займаюся каратэ ў клубе. Таксама захапляюся блогамі і спрабую сама здымаць відэа і весці свае старонкі ў сацыяльных сетках, — гаворыць 15-гадовая аўтарка. — Люблю стасункаваць з крэатыўнымі і пазітыўнымі людзьмі: яны дораць мне наймацнейшае натхненне. Аб прафесіі думаю так: праца павінна быць у задавальненне. Я планую паступаць у інстытут журналістыкі, мяркую, у гэтай прафесіі маё месца. А цяпер стараюся развівацца па ўсіх кірунках.

# СВАЯ «ДАРОЖКА» ДА АЛІМПІЙСКАГА ЗОЛАТА

**«Я веру, я змагу, я вытрымаю!» — паўтараў унутраны голас. Спартсмен займае сваё месца ў каноэ. Збіраецца з думкамі. Секунда і... старт! Паскараецца, што ёсць моцы. Сапернікі не адстаюць. Хутка вырашыцца тое, да чаго так доўга імкнуўся. Сэрца падказвае: поспех — блізка! Глыбокі ўдых, апошні рывок, выдых. Фініш! Ён — пераможца!**



Сучасная моладзь мае невычарпальную колькасць магчымасцяў для самарэалізацыі. Нехта знаходзіць сябе ў творчасці, для кагосьці навука найцікавейшая за ўсе іншыя заняткі, а чыясьці мара — адчуць смак перамогі на спартыўных спаборніцтвах.

У 2013 годзе мара аднаго з маладых і перспектыўных спартсменаў Гродзеншчыны здзейснілася. Ён — Дзмітрый Лапата — першы раз стаў пераможцам чэмпіянату Беларусі сярод мужчын па веславанні на каноэ. Гісторыя паўтараецца ў 2014 і 2015 гадах, калі Дзмітрый зноў паказвае выдатны вынік не толькі на чэмпіянаце краіны, але і на еўрапейскіх спаборніцтвах у Францыі (сярод юніёраў да 19 гадоў) і Румыніі (сярод моладзі да 23 гадоў), дзе завяўвае «серабро».

Дасягненні гэтага маладога і энергічнага спартсмена з'яўляюцца вынікам плённай шматгадовай працы. Дарэчы, у спорт Дзмітрый прыйшоў у васьмігадовым узросце і ўжо пасля трэцяга заняткаў пачаў трэніравацца са старэйшымі наведвальнікамі секцыі. «Мне заўсёды падабалася і падабаецца трэніравацца з тымі, хто больш моцны і вопытны за мяне, — кажа мой суразмоўца, — бо ў іх я вучуся нечаму новаму».

Будні спартсменаў вызначаюцца асаблівым рытмам жыцця. Амаль заўсёды Дзмітрый знаходзіцца на зборах, практычна не бываючы дома. І падчас нашай размовы ў «Скайпе» ён таксама быў далёка ад радзімы — на зборах у Партугаліі. Хлопец адзначае: «Гэта вельмі цікава — падарожнічаць, але доўгія пералёты або пераезды парушаюць рэжым сну і адпачынку, што, зразумела, не вельмі добра для спартсмена».

**ПРА АЎТАРА**

Юля нарадзілася на мілай яе сэрцу Мастоўшчыне, у аграгарадку Дубна. «Вельмі люблю гэты куток за яго бясконца цікавую гісторыю, добразычлівых людзей і прыгожыя пейзажы».

Хутка наша 17-гадовая аўтарка закончыць школу. «Сумна развітацца з ёй — тут я адкрыла ў сабе многія якасці і здольнасці, удзельнічала ў цікавых праектах, конкурсах, алімпіядах, канферэнцыях, была вядучай шматлікіх мерапрыемстваў, — кажа дзяўчына. — Кім хачу стаць, вырашыла яшчэ ў 8 класе. Мая мара — стаць журналістам. Яго праца — гэта новыя знаёмствы, шмат адкрыццяў, а самае галоўнае — творчасць! Лічу, што калі працаваць і верыць у добры вынік, то ўсё абавязкова атрымаецца».

Пасля заканчэння вучылішча алімпійскага рэзерву ў Гродне паўстала пытанне аб будучай прафесіі хлопца, але яго адказ быў адназначны: «Я і спорт — адзінае цэлае». Сёння Дзмітрый Лапата — студэнт ГрДУ імя Янкі Купалы, дзе ён навучаецца на факультэце фізічнай культуры і спорту.

Спартыўныя дасягненні маладога весляра не засталіся незаўважанымі. Летась яго ўключылі ў спіс стыпендыятаў Прэзідэнцкага спартыўнага клуба, а з 2016-га ён атрымлівае абласную стыпендыю.

Увогуле, Дзмітрый — вельмі добры чалавек. Размаўляць з ім лёгка і цікава! Спартсмен запэўнівае, што ўсё наша жыццё — гэта неспадзяванкі, і калі мы будзем імкнуцца да сваіх мэт, жаданняў, мар, то гэтыя неспадзяванкі абавязкова будуць толькі прыемнымі! Ён шмат гаворыць аб сваім трэнеры: «Яго падтрымка для мяне вельмі важная. Трэнер — чалавек, які заўсёды побач, якому я ўдзячны за многае». «Ніколі не здавацца!» — словы, якія сталі сапраўдным дэвізам хлопца.

«Спорт падараваў мне мэту і дапамог дабіцца такіх вынікаў, — гаворыць Дзмітрый, — менавіта дзякуючы яму я даведаўся, да чаго трэба імкнуцца, пабываў у такіх краінах, як Францыя, Венгрыя, Румынія, Партугалія, Польшча, Малдова». На маё пытанне аб марах малады чалавек адказаў не раздумваючы: «Мая мара і мэта крочаць заўсёды разам. Напэўна, як і любы спартсмен, я мару аб алімпійскім «золаце». Але наперадзе яшчэ шмат працы, трэніровак і цяжкасцей, якія я павінен пераадолець».

**Юлія МАЦІЕЎСКАЯ,**
**вучаніца 11 класа Дубненскай СШ Мастоўскага раёна.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУ